■ Афіцыйна

Сяргей Папкоў назначаны міністрам сувязі і інфарматызацыі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка назначыў Сяргея Папкова міністрам сувязі і інфарматызацыі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Мікалай Панцялей вызвалены ад пасады міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь у сувязі з выхадам у адстаўку.

Адпаведныя ўказы кіраўнік дзяржавы падпісаў 21 лютага.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка таксама ўзгадніў назначэнне Дзмітрыя Шадко першым намеснікам міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, Інэсы Канцавой — намеснікам міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнтам дадзена згода на вызваленне Івана Рака ад пасады першага намесніка міністра сувязі і інфарматызацыі, Мікалая Струкава — ад пасады намесніка міністра сувязі і інфарматызацыі Беларусі.

Скароцяць колькасць папраўчых устаноў закрытага тыпу

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 лютага прыняў з дакладам міністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Міністр далажыў аб выніках работы органаў унутраных спраў у 2013-м і пачатку 2014 года, крымінагеннай абстаноўцы і некаторых аператыўных матэрыялах, якія знаходзяцца ў вядзенні.

Увага таксама была ўдзелена працэсу рэфарміравання органаў унутраных спраў. Да гэтага працэсу далучаны і Дэпартамент выканання пакаранняў МУС.

Паводле слоў Ігара Шуневіча, на працягу ўжо некалькіх гадоў адзначаецца зніжэнне колькасці асоб, якія асуджаюцца да пазбаўлення волі. Па выніках аналізу аператыўнай абстаноўкі кіраўніку дзяржавы прапанавана скараціць дзве папраўчыя ўстановы закрытага тыпу, у тым ліку адну калонію для непаўналетніх. Адпаведнае рашэнне адобрана і будзе рэалізавана ў бліжэйшы час.

Аляксандр Лукашэнка прысвоіў генеральскія званні

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 20 лютага падпісаў указы аб прысваенні воінскіх і спецыяльных званняў. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Чарговае воінскае званне генерал-маёра прысвоена палкоўнікам Вадзіму Дзенісенку і Юрыю Караеву.

Палкоўнікам юстыцыі Сяргею Буйноўскаму і Валерыю Гайдучонку прысвоена чарговае спецыяльнае званне генерал-маёра юстыцыі.

Чарговае спецыяльнае званне генерал-маёра ўнутранай службы прысвоена Васілю Сцепаненку.

Акрамя таго, намесніку генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Аляксею Стуку прысвоены класны чын дзяржаўнага саветніка юстыцыі 3-га класа.

■

ПАДТРЫМКА ПА АДРАСЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але, Ігар Мікалаевіч, вы можаце разлічваць на бясплатнае харчаванне для вашага малога. Таксама вы можаце звярнуцца ў Лельчыцкі райвыканкам па аднаразовую дапамогу, якая можа дасягаць да 10 БПМ.

— Я тэлефаную вам з Глыбокага Віцебскай вобласці. Мяне завуць Шарабайка Зінаіда Пятроўна. У мяне бабулька — 91 год, якая ўжо не ходзіць. Колькі разоў я магу звярнуцца па дапамогу на набыццё падгузкаў?

— Зінаіда Пятроўна, а бабулька ў вас інвалід?

— Не, яна проста вельмі старая.

— Дапамога на набыццё падгузкаў прадугледжана для інвалідаў 1 групы. Таму, калі ваша бабулька не ходзіць, трэба аформіць інваліднасць. Тады зможаце атрымаць гэтую дапамогу. Яна выдаецца чатыры разы ў год і сумарна раўняецца 6 БПМ. Чалавеку без інваліднасці такая дапамога не прадугледжана.

— Але няхораша так ставіцца да такіх людзей... Я, канешне, буду і далей купляць падгузкі за свае грошы...

— Зінаіда Пятроўна, трэба ўсё ж такі, каб вы сабралі адпаведныя дакументы — гэта ў вашых жа інтарэсах. Тады вашай бабульцы будзе ісці і дадатак да пенсіі, і розныя льготы. Вы вельмі выйграеце.

— Я разумею, але гэта вельмі нялёгка, ды яшчэ з чалавекам, які не ходзіць.

— Калі бабулька ляжачая, медработнікі павінны прыходзіць дахаты, у тым ліку і для афармлення дакументаў. У вашым упраўленні працы, занятасці і сацыяльнай абароны добрыя супрацоўнікі, я іх ведаю. Вы, калі ласка, падыдзіце да іх, скажыце, што тэлефанавалі на «прамую лінію». І калі вам усё ж такі адкажуць, тады я буду разбірацца. Я разумею, што трэба пахадзіць, сабраць дакументы, выдаткаваць час, але з адных вашых слоў вам не могуць назначыць дапамогу — ёсць пэўны парадак. Так што вам неабходна гэтым заняцца.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Добры дзень! Валянціна Усцінаўна са Смаргонскага раёна тэлефануе. Мая дачка нарадзіла трэцяе дзіця. Яна мае права на бясплатнае харчаванне? Наогул, якія льготы прадугледжаны ў такім выпадку?

— Сям'я вашай дачкі зараз належыць да шматдзетных сем'яў і мае права на матэрыяльную і сацыяльную дапамогу. Напэўна, вам ужо сказалі, што пры нараджэнні трэцяга дзіцяці і наступных дзяцей сям'я мае права атрымаць суму, роўную 50 бюджэтам пражытачнага мінімуму.

На адрасную сацыяльную дапамогу ў выглядзе прадуктаў харчавання для дзяцей першых двух гадоў жыцця могуць разлічваць сем'і, у якіх сярэднедушавы даход ніжэйшы за крытэрый патрэбнасці (1 128 тыс. рублёў).

Плата за ўтрыманне дзяцей у садках зніжаецца напалову для сем'яў, якія маюць траіх і больш дзяцей да 18 гадоў.

Дзеці са шматдзетных сем'яў маюць права атрымліваць бясплатна дадатковую адукацыю ў школах мастацтваў.

Да навучальнага года вялікія сем'і, дзе дзеці вучацца ва ўстановах агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, атрымліваюць аднаразовую дапамогу — да 30% БПМ на кожнага навучэнца. Для гэтага трэба пакінуць у школе адпаведную заяву.

Плата за карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі для дзяцей з вялікіх сем'яў зніжаецца на 50%.

Калі ў сям'і трое і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, школьнікам, навучэнцам устаноў спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама ўстаноў вышэйшай адукацыі пры засваенні адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі прызначаецца бясплатнае харчаванне.

Маці (бацьку, апекуну, папячыцелю), якая выхоўвае траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, прадастаўляецца адзін дадатковы свабодны ад працы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку.

Кіраўнікі ВНУ, ССНУ, ПТВ і каледжаў маюць права прадастаўляць зніжкі з кошту навучання ў парадку і памерах, якія вызначаюцца ўрадам, выхадцам з сем'яў, дзе трое і больш непаўналетніх.

— Дзякуй за інфармацыю!

Святлана БУСЬКО.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

ДАВЕДКА «Звязды»

Асноўнымі атрымальнікамі штомесячнай і аднаразовай сацыяльных дапамог традыцыйна з'яўляюцца шматдзетныя і няпоўныя сем'і, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей, — 75%. Колькасць адзінокіх пенсіянераў і інвалідаў у агульнай колькасці атрымальнікаў названых дапамог склала летась 3,6 тыс. чалавек, ці 3,6%.

■ Эканоміка адукацыі

ВЫНІКІ АПТЫМІЗАЦЫІ: МІНУС 12 ТЫСЯЧ РАБОТНІКАЎ

«Пытанні аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі найбольш актуальныя для кіраўніцтва галіновага прафсаюза», — падкрэсліў у сваім выступленні на калегіі галоўнага адукацыйнага ведамства старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.

На працягу года наймальнікі сумесна з прафсаюзнымі камітэтамі прымалі меры па працаўладкаванні работнікаў, скарочаных у выніку аптымізацыі: прапаноўвалі ім новыя працоўныя месцы, пераразмяркоўвалі нагрузку, накіроўвалі на курсы перападрыхтоўкі. І ўсё ж, нягледзячы на ўсе намаганні, за 2013 год па скарачэнні штатаў было звольнена 640 работнікаў, у тым ліку 249 педагагічных работнікаў. На 1 студзеня 2014 года ў цэнтрах занятасці насельніцтва знаходзяцца на ўліку як беспрацоўныя 217 былых работнікаў арганізацый адукацыі, у тым ліку 159 педагагічных работнікаў.

Па звестках Міністэрства адукацыі, у выніку праведзенай аптымізацыі колькасць работнікаў устаноў адукацыі ўсіх узроўняў скарацілася на 12 тысяч чалавек. А гэта, між іншым, цэлы раённы цэнтр! У 2013 годзе былі закрыты 109 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і 143 установы рэарганізаваны. Былі ліквідаваны ўсе вячэрнія школы, а замест іх на базе 57 агульнаадукацыйных устаноў адкрыты вячэрнія класы.Таксама былі закрыты 20 міжшкольных вучэбна-вытворчых камбінатаў працоўнага навучання і прафесійнай арыентацыі. І тры міжшкольныя вучэбна-вытворчыя камбінаты былі далучаны ў якасці філіялаў да ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Пасля правядзення мерапрыемстваў па павелічэнні напаўняльнасці класаў колькасць I—XI класаў скарацілася ў параўнанні з папярэднім навучальным годам на 2 357. У гарадскіх установах адукацыі колькасць класаў зменшылася на 1992, а ва ўстановах адукацыі, размешчаных у сельскіх населеных пунктах, — на 365 класаў.

Колькасць устаноў, у якіх функцыянуюць X—XI-я класы з напаўняльнасцю ад 1 да 5 чалавек, зменшылася на 137. Аднак у гэтым навучальным годзе зноў было адкрыта 87 дзясятых класаў з колькасцю вучняў менш як 5 чалавек. У 108 установах адукацыі напаўняльнасць дзясятых класаў складае менш як 5 навучэнцаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:

У гэтым навучальным годзе было адкрыта 87 дзясятых класаў з колькасцю вучняў менш як 5 чалавек. Да таго ж у краіне функцыянуюць 312 класаў з 1 навучэнцам.

Відавочна, што і сёлета аптымізацыя сеткі ўстаноў адукацыі будзе актуальнай тэмай для галіны: на жаль, колькасць навучэнцаў у многіх сельскіх навучальных установах паранейшаму скарачаецца...

Пры гэтым пытанне аптымізацыі актуальнае не толькі для ўстаноў дашкольнай ці агульнай сярэдняй адукацыі. Летась упершыню ў краіне былі распрацаваны тыпавыя штаты нарматываў колькасці работнікаў устаноў вышэйшай адукацыі. У выніку чаго некаторыя ВНУ таксама правялі скарачэнне работнікаў. Аднак па выніках аптымізацыі колькасці работнікаў дзяржаўныя ўстановы вышэйшай адукацыі атрымалі бюджэтнае фінансаванне на ўстанаўленне дадатковых мер матэрыяльнага стымулявання ў рамках кантрактнай формы найму.

Як зазначыў **міністр адукацыі Сяргей Маскевіч,** самымі фінансаваёмістымі ўзроўнямі адукацыі застаюцца дашкольная і агульная сярэдняя адукацыі, на якія прыпадае 66,7% ад агульных аб'ёмаў фінансавання адукацыі.

— Хацеў бы звярнуць увагу, што істотна выраслі за год выдаткі ў сістэме прафесійнай адукацыі. Відавочна, што ўстановы прафесійнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі — зона асаблівай неэфектыўнасці, — падкрэсліў міністр.— Упраўленні прафесійнай адукацыі і Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі не надаюць належнай увагі пытанням эканамічнай эфектыўнасці сістэмы прафесійнай адукацыі. У выніку мы масава рыхтуем рабочага па праграме сярэдняй спецыяльнай адукацыі, разлічанай на чатыры гады.

Па выніках калегіі пагадненне паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускім прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі на 2013—2016 гады было дапоўнена новымі палажэннямі. Сярод іх — палажэнні, закліканыя рэгуляваць работу педагогаў у шосты школьны дзень, пытанні прадастаўлення метадычнага дня, пашырэння пераліку тыпаў устаноў адукацыі і пасад педагагічных работнікаў, якія маюць права на штомесячныя кампенсацыі выдаткаў на метадычную літаратуру, устанаўленне дадатковых мер сацыяльнай абароны асобам, з якімі не плануецца працягваць працоўныя адносіны пры аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, і іншыя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Фінансавы складнік

КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ — І «СВАІМ», І ІНВЕСТАРАМ

Беларусы аддаюць перавагу звычайным банкаўскім рахункам, аднак даход ад уласных грошай можна атрымаць і іншым спосабам, напрыклад, набываючы акцыі розных прадпрыемстваў. Праект закона «Аб рынку каштоўных папер» мае намер расставіць акцэнты ў гэтай сферы, у прыватнасці, зрабіць закон адпаведным часу. На «круглым стале», прысвечаным абмеркаванню законапраекта, прадстаўнікі пастаянных камісій Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах і Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах сумесна з Беларускай валютна-фондавай біржай зрабілі свае прагнозы па развіцці рынку каштоўных папер у нашай краіне.

Мяняецца мысленне — мяняецца закон

Ранейшы закон быў прыняты ў 1992 годзе, натуральна, за больш чым 20 гадоў ён зрабіўся неактуальным. На практыцы і ў юрыдычных арганізацый, і асабліва ў звычайных людзей узнікае шмат пытанняў, звязаных з каштоўнымі паперамі. **Валерый БАРАДЗЕНЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па бюджэце і фінансах,** адзначыў, што адной з навацый стане стварэнне самарэгуляванай арганізацыі прафесійных удзельнікаў рынку каштоўных папер, якая будзе вырашаць многія праблемы.

Праект новага закона змяшчае намнога больш артыкулаў, чым стары. «Вядома, ён у большай ступені ўлічвае вопыт Расійскай Федэрацыі — абавязкова павінны былі быць улічаны сур'ёзныя дамоўленасці пра тое, што мы будзем рухацца да агульнага рынку фінансаў, — падкрэсліў Барадзеня. — У аснову пакладзены ўсе прынцыпы, якія ёсць у адпаведных заканадаўчых актах Расіі і Казахстана, так што ён максімальна ўніфікаваны ўжо сёння».

Крок насустрач інвестарам

Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах канстатаваў, што ад узроўню развіцця рынку каштоўных папер залежыць агульны ўзровень канкурэнтаздольнасці эканомікі нашай краіны. Так, у 2014 годзе ўрад плануе прыцягнуць праз размяшчэнне валютных аблігацый прыкладна палову сродкаў, неабходных для плацяжоў па знешнім доўгу.

У 2014 годзе ўрад плануе прыцягнуць праз размяшчэнне валютных аблігацый прыкладна палову сродкаў, неабходных для плацяжоў па знешнім доўгу.

Панцюхоў назваў некаторыя праблемы сферы — гэта нежаданне інвестараў уваходзіць у рынак каштоўных папер, недахоп інвестыцыйных магчымасцяў, недастатковая дасведчанасць патэнцыяльных удзельнікаў рынку каштоўных папер пра яго магчымасці. «Нам вельмі важна прыцягнуць увагу насельніцтва да магчымасцяў рынку каштоўных папер як крыніцы ўласных даходаў, — заявіў ён. — Мы плануем прыняць якасны закон па рынку каштоўных папер».

Рынак праблемны, але перспектыўны

«Пакуль што на ўсіх важных сустрэчах у Беларусі і за мяжой мы пазіцыянуем рынак каштоўных папер як рынак, які знаходзіцца на стадыі станаўлення, — заявіў **Сяргей СУШКО, дырэктар дэпартамента па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь.** — Сёння створаны ўсе неабходныя умовы для прыцягнення рэсурсаў у эканоміку краіны праз выпуск акцый, аблігацый — сфарміравана заканадаўства і інфраструктура».

Па словах дырэктара дэпартамента па каштоўных паперах, для эфектыўнага функцыянавання адпаведнага рынку сёння значна спрошчаны адміністрацыйныя працэдуры, звязаныя з выпускам і абарачэннем каштоўных папер. Колькасць дакументаў, якія трэба падаваць для дзяржаўнай рэгістрацыі каштоўных папер, зменшана, з 30 да 15 дзён скарочаны тэрмін іх рэгістрацыі. «Мы працуем ва ўмовах зніжанай падатковай нагрузкі на ўдзельнікаў рынку каштоўных папер, — адзначыў Сушко. — Сёння эмісійны даход па акцыях і даход па аблігацыях вызвалены ад падаткаабкладання. Зніжаны падатковыя стаўкі па даходах ад продажу акцый — сёння яны складаюць 12% для фізічных асоб і эмітэнтаў і 9% для юрыдычных. Няма абмежаванняў на набыццё каштоўных папер нерэзідэнтамі (грамадзянамі іншых дзяржаў)».

Разам з тым Сяргей Сушко прызнаў, што ўзровень развіцця рынку каштоўных папер застаецца нізкім з-за адсутнасці ў Беларусі інстытутаў калектыўных інвестыцый (інвестыцыйных фондаў), стрыманай палітыкі ў сферы прыватызацыі і кіравання дзяржаўнай маёмасцю.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

■ Нефармат

КАЛІ ЗЛА СТАНОВІЦЦА БОЛЬШ...

Не збіралася пісаць пра падзеі ва Украіне. Не мая гэта тэма... Але пазваніла даўняя сяброўка, сказала, што яе калега па рабоце шукае домік у вёсцы для сваёй маці. Хочуць, вядома, недалёка ад Брэста. Калега родам з Украіны, але працуе ў Брэсце, у буйной будаўнічай арганізацыі. Тады, у 1980-я гады, многія хлопцы і дзяўчаты з суседніх раёнаў Украіны вучыліся ў Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце. Нямала выпускнікоў-украінцаў працуе і жыве цяпер у абласным цэнтры. Вось і Таццяна выйшла замуж за брэсцкага хлопца, засталася ў нашым горадзе назаўсёды. А маці жыла ў маленькім райцэнтры недалёка ад Кіева. Актыўнымі пошукамі пакупнікоў на яе кватэру сваякі заняліся адразу, як распачаўся Майдан. Вядома, сталая жанчына не вельмі хацела з'язджаць з горада, дзе выгадавала дзяцей, дзе застаецца магіла яе мужа, дзе прайшло ўсё жыццё. Але дзеці пабаяліся пакідаць яе там. Настаялі. Кватэру прадалі даволі танна, у Брэсце за такія грошы нічога не купіш. Таму выбралі варыянт пошуку доміка ў вёсцы. Цяпер вельмі рады, што мама пераехала да пачатку самых крывавых падзей. А яна глядзіць тэлевізар і плача. Штодня...

Вось наступствы падзей ва Украіне, пра якія пакуль ніхто не гаворыць. Тут хоць бы неяк пастарацца ўсвядоміць тое, што адбываецца — смерць, калецтва людзей. Каму ёсць справа да нейкай невядомай пенсіянеркі, якую дзеці фактычна прымусілі пакінуць роднае гняздо? А яна хіба не ахвяра?

Хіба не ахвяра той камандзір вайсковай часці, дзе гвалтам забралі зброю і патроны? Паводле вайсковага статута, ён павінен быў страляць у рабаўнікоў. Відаць, не змог. Не кожны зможа адкрыць агонь па сваіх людзях. А маладзенькія міліцыянеры? А выпадковыя людзі, якія аказаліся не ў тым месцы не ў той час? А тыя, хто не дачакаўся «хуткую» з сардэчным ці іншым прыступам, бо брыгада медыкаў была занята дапамогай шматлікім параненым і скалечаным? Вайна ўсё спіша. Як напісаў адзін блогер, пераможцы «павесяць ахвяры» на пераможаных. І ніхто ніколі не даведаецца ўсёй праўды. Ды і каму яна ўжо будзе патрэбна, тая праўда? Маці дзяўчыны, якая здымала падзеі на тэлекамеру і якую застрэліў снайпер, родныя другой дзяўчыны-валанцёра, што спрабавала дапамагчы параненаму і ўпала ад снайперскай кулі, ды пляваць ім на іх праўду, іх лозунгі аб свабоднай і незалежнай Украіне, палітычную трасканю з абодвух бакоў! Смерць людзей перакрэсліла ўсё, што было раней.

Хоць пачынаўся Майдан нават даволі рамантычна. Спявалі песні, кармілі баршчом і кашай усіх ахвотных, прадавалі рэвалюцыйныя сувеніры. Усе таблоіды наперабой пісалі, гарэлку чыёй вытворчасці бясплатна раздаюць пратэстантам, колькі грошай плацяць за дзень і як клапоцяцца пра сексуальную бяспеку рэвалюцыянераў, раздаючы сродкі індывідуальнай кантрацэпцыі. Мажныя жанчыны, якія гандлююць на рынках іншых гарадоў, асуджалі пратэстантаў у камеру, называючы іх лайдакамі. Шчырае неразуменне выказвалі стомленыя шахцёры. Яны ж, новыя жыхары Майдана, лічылі сябе сапраўднымі рэвалюцыянерамі-героямі. Але з рэвалюцыяй жартаваць нельга. Даўным-даўно пасля Вялікай французскай буржуазнай рэвалюцыі было сказана, што ўсялякая рэвалюцыя рана ці позна знішчае сваіх дзяцей. Жорстка, але, відаць, праўдзіва.

Цяпер ужо не важна, хто ў каго страляе ў Кіеве, хто ў чыю форму пераапранаецца, хто якія правакацыі здзяйсняе. Кожны канал пакажа тое, што адпавядае яго патрабаванням. А матэрыялу хопіць на ўсіх. Ігракоў на гэтай арэне колькі хочаш: улада, алігархі, падбухторшчыкі з замежжа, кіраўнікі радыкальных груповак. Кожны думае аб перамозе і сваіх амбіцыях. А пра Украіну, пра яе простых людзей, такіх, як пенсіянерка, што тэрмінова пераехала да дзяцей у іншую краіну, думаць, відаць, няма каму.

А думаць трэба было раней. Думаць, чаму краіна з даволі значнымі прыроднымі рэсурсамі, выхадам да мора, урадлівымі землямі, такая бедная, чаму так распаўсюджана ў ёй карупцыя. Калі не думалі самі, то падумалі іншыя і ўмела выкарысталі незадаволенасць вялікай часткі народа. І нават у гэтай сітуацыі вайну трэба было папярэдзіць любой цаной. Цяпер жа ўсё стала няважна. Цяпер ніхто не можа прадбачыць, якія наступствы нясе ў сабе гэтая небяспека.

Бацькі маіх суседзяў жывуць у адной з вёсак Маларыцкага раёна, на самай мяжы з Украінай. Яны ўжо выказваюць трывогу. Вяскоўцы добра памятаюць канец 1940-х -пачатак 1950-х гадоў, калі ў лясах заставаліся бандэраўцы. Бандыты паводзілі сябе часам горш за фашыстаў. Пра гэта мне, дарэчы, шмат расказваў і кіраўнік музея Мельніцкай школы Маларыцкага раёна Пётр Ківачук. Старыя людзі нездарма пазіраюць з апасеннем у бок суседзяў. Яны на ўласным досведзе ведаюць, што вайна — гэта яшчэ бандытызм і разруха. Зло ж заўсёды ўмела знаходзіць свае сцежкі. А сёння ва Украіне зло святкуе баль. І няважна, якімі высакароднымі заклікамі яно прыкрываецца.

...Раптам успомніўся фрагмент аднаго старога фільма пра расійскіх рэвалюцыянераў-тэрарыстаў. Ад бомбы мсціўцы загінуў вялікі князь — родны брат цара. Вялікая княгіня прыйшла ў камеру да асуджанага. Яна прагнула даведацца, чаму малады чалавек забіў дарагога ёй чалавека. «Я хацеў, каб зла ў свеце стала менш», — выгукнуў фанатык. «Але яго стала больш», — горка канстатавала жанчына.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

МЗС РЭКАМЕНДУЕ БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДЗЯНАМ УСТРЫМАЦЦА АД ПАЕЗДАК ВА УКРАІНУ

Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь рэкамендуе беларускім грамадзянам устрымацца без крайняй неабходнасці ад паездак ва Украіну, асабліва ў горад Кіеў і Кіеўскую вобласць, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў знешнепалітычным ведамстве нашай краіны.

«У сувязі з падзеямі, якія адбываюцца ва Украіне, блакіраваннем аўтатрас, пад'ездаў да міжнароднага аэрапорта Барыспаль, маючымі месца абстрэламі транспартных сродкаў і фактамі марадзёрства Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь рэкамендуе беларускім грамадзянам устрымацца без крайняй неабходнасці ад паездак ва Украіну, асабліва ў горад Кіеў і Кіеўскую вобласць», — адзначылі ў МЗС Беларусі.

Акрамя таго, грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца ва Украіне, настойліва рэкамендуецца пазбягаць наведвання месцаў правядзення пратэсных акцый да нармалізацыі абстаноўкі.

«ДОБРЫ ДЗЕНЬ, МАЯ КАХАНАЯ!»

Крэатыўныя працаўнікі пошты разам з афіцэрамі ваеннага камісарыята Віцебскай вобласці праводзяць конкурс сачыненняў эпісталярнага жанру сярод салдат.

— Ніякае SMS-паведамленне або тэлефонная размова і ў наша стагоддзе «высокіх тэхналогій» не заменяць аркуша з родным почыркам. Дзіўна, як з дапамогай паперы і ручкі можна перадаць перажыванні, тугу чалавека, які зараз далёка ад каханых, родных, сяброў... Першы такі конкурс летась прайшоў «на ўра»! Сачыненні нашых салдат да слёз узрушвалі сваёй душэўнасцю і шчырасцю! Ніхто з пераможцаў не застаўся без прыза і дыплома. Сёлета чакаем большай актыўнасці, бо тэма конкурсу блізкая для кожнага салдата», — паведаміла «Звяздзе» Кацярына Зінкевіч, намеснік дырэктара Віцебскага філіяла РУП «Белпошта».

Даслаць сваё сачыненне на зададзеную тэму можна простым або заказным лістом — у аддзел маркетынгу Віцебскага філіяла РУП «Белпошта» (пр. Маскоўскі, д.10, 210015, г.Віцебск) — да 1 сакавіка. Падвядзенне вынікаў адбудзецца 10 сакавіка 2014 года. Пераможцаў чакаюць дыпломы і памятныя падарункі ад Віцебскага філіяла РУП «Белпошта».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У ГОМЕЛІ З'ЯВІЦЦА ПАДЗЕМНЫ ЎНІВЕРМАГ

Вялізную краму ў абласным цэнтры пабудуюць на вуліцы Савецкай, каля карпусоў дома № 97. Гандлёвы цэнтр будзе займаць плошчу 3 тысячы квадратных метраў. Пад зямлёй будуць размешчаны брэндавыя крамы. Не выключана, што там будзе знаходзіцца і аб'ект грамадскага харчавання.

Між тым, і жыхары Навабеліцкага раёна Гомеля не застануцца без магчымасцяў шопінгу недалёка ад дома. У бліжэйшыя два гады на тэрыторыі раёна плануецца адкрыць тры буйныя гандлёвыя аб'екты. У тым ліку ў новым мікрараёне № 104, пакуль абдзеленым інфраструктурай, будзе пабудаваны гандлёвы цэнтр плошчай каля 800 кв.м, а недалёка, у былым будынку завода «Крышталь», з'явіцца супермаркет плошчай больш за 5 тысяч кв.м.

Начальнік упраўлення гандлю і паслуг Гомельскага гарвыканкама Святлана Караткевіч расказала, што зусім хутка будынак былога завода «Сантэп» у жылой частцы Савецкага раёна Гомеля ператворыцца ў вялізны гандлёвы цэнтр плошчай 23 тыс. кв.м, які не мае аналагаў у Гомелі. У ім будуць зоны для гандлю прадуктамі і прамысловымі таварамі, рэстаран хуткага харчавання, а таксама кінатэатр і пакоі для гульні. «На падыходзе» і новы супермаркет на Рэчыцкім праспекце, дзе ўжо ідуць унутраныя работы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У ЛЖЭПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ КАНФІСКАВАЛІ 12 ДАРАГІХ МАШЫН

Спынілі дзейнасць злачыннай групы, якая незаконным прадпрымальніцтвам нанесла ўрон дзяржаве ў памеры больш за Br6 млрд.

— У Мінску на працягу 4 гадоў злачынная група ад імя 70 падкантрольных ёй ілжэпрадпрымальніцкіх структур ажыццяўляла прадпрымальніцкую дзейнасць без дзяржаўнай рэгістрацыі, — паведаміў намеснік начальніка галоўнага следчага ўпраўлення Следчага камітэта Беларусі Дзмітрый Вараб'ёў. — Затрымалі трох актыўных удзельнікаў гэтай групы, у дачыненні да іх расследуецца крымінальная справа.

Акрамя таго, Дэпартамент фінансавых расследаванняў КДК распачаў крымінальную справу ў дачыненні да 12 службовых асоб, 10 прадпрыемстваў, якія з'яўляліся кліентамі гэтых лжэпрадпрымальніцкіх структур. Яны абвінавачваюцца ва ўхіленні ад выплаты падаткаў.

Каб кампенсаваць нанесены ўрон, на маёмасць і грашовыя сродкі фігурантаў крымінальных спраў накладзены арышт у суме больш за $ 340 тыс, канфіскавана 12 дарагіх легкавых аўтамабіляў на агульную суму Br2,55 млрд.

Дарэчы, цяпер Следчы камітэт расследуе каля 10 аналагічных спраў, звязаных з незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Надзея ПАЎЛАВА.

А ПАЎЛА ЎЖО НЕ ВЯРНУЦЬ...

Блізкія 16-гадовага падлетка з Чэрыкава ў шоку. Павел скончыў жыццё самагубствам, павесіўшыся на гарышчы дома, у якім жыў. Праверкай няшчаснага выпадку займаецца Чэрыкаўскі райаддзел Следчага камітэта. Па адной з версій, прычынай таго, што здарылася, магло стаць няшчаснае каханне.

Нэлі ЗІГУЛЯ.